*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 САКАВІКА 2009 г. АЎТОРАК

№ 54 (26412)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## Аляксандр ЛУКАШЭНКА: «Беларусь падтрымлівае расійскія прапановы да саміту «дваццаткі» ў Лондане»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па запрашэнні свайго расійскага калегі Дзмітрыя Мядзведзева знаходзіўся з рабочым візітам у Расійскай Федэрацыі.**

У адпаведнасці з дамоўленасцямі, дасягнутымі ў ходзе сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў 19 сакавіка, прэзідэнты прадоўжылі пачатую размову ў нефармальнай абстаноўцы ў Сочы.

На парадку дня — шырокае кола пытанняў двухбаковых адносінаў, міжнародная праблематыка.

У пачатку сустрэчы кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі магчымасць узвядзення аб'ектаў зімовай Алімпіяды 2014 года з удзелам беларускіх будаўнікоў. Дзмітрый Мядзведзеў, у прыватнасці, прапанаваў беларускаму боку паўдзельнічаць у некалькіх буйных праектах. Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым расказаў расійскаму калегу, што Беларусь рэалізуе буйны інвестыцыйны праект па будаўніцтве біят-лоннага стадыёна. «Мы хочам, каб вы ўніклі ў ход будаўніцтва і аказалі нам садзейнічанне», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Закрануўшы тэму запланаванага на 2 красавіка Лонданскага саміту «дваццаткі», Аляксандр Лукашэнка сказаў, што беларускі ўрад прапрацаваў прапановы расійскага боку, падрыхтаваныя да саміту. «Мы абсалютна іх падтрымліваем», — дадаў беларускі лідар.

Дзмітрый Мядзведзеў адзначыў, што ў час сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам будуць абмеркаваны «пытанні міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, інтэграцыйныя працэсы, а таксама міжнародная праблематыка».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Прыродаахоўныя збудаванні ў Беларусі вызвалены ад падатку на нерухомую маёмасць

**У Беларусі зацверджаны Пералік будынкаў і збудаванняў, прызначаных для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі, вызваляемых ад абкладання падаткам на нерухомую маёмасць. Адпаведны ўказ № 144 «Аб асобных пытаннях падаткаабкладання» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 20 сакавіка.**

Указ прыводзіць прававыя акты кіраўніка дзяржавы па пытаннях выплаты падатку на нерухомую маёмасць у адпаведнасць з унесенымі змяненнямі ў закон Рэспублікі Беларусь «Аб падатку на нерухомую маёмасць», што ўступілі ў сілу з 1 студзеня 2009 года.

У адпаведнасці з гэтым законам з 1 студзеня 2009 года падаткам на нерухомую маёмасць абкладаюцца будынкі і збудаванні (раней абкладаліся ўсе асноўныя сродкі). На падставе гэтага ўказам зацверджаны пералік будынкаў і збудаванняў, прызначаных для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі, вызваляемых ад абкладання падаткам на нерухомую маёмасць. Пры гэтым прызнаецца страціўшым сілу ўказ Прэзідэнта ад 7 сакавіка 2006 года № 142 «Аб зацвярджэнні пераліку асноўных сродкаў, прызначаных для аховы навакольнага асяроддзя і паляпшэння экалагічнай абстаноўкі, вызваляемых ад абкладання падаткам на нерухомую маёмасць».

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Цэнаўтварэнне пры будаўніцтве жылля будзе пад строгім кантролем

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Беларусі распачаў праверачныя мерапрыемствы па пытаннях цэнаўтварэння пры будаўніцтве жылля. Сумы, паведаміў кіраўнік кантрольнага ведамства Зянон Ломаць, праводзячы «прамую лінію» з жыхарамі Гродзеншчыны, павялічваюцца за кошт прыпісак, завышэння аб'ёмаў будаўніча-мантажных работ. Ёсць прыклады, калі нават айчынная прадукцыя набываецца праз пасрэднікаў. Па адным з жыллёва-будаўнічых кааператываў ужо ўнесена прапанова аб змяншэнні цаны квадратнага метра на 225 тысяч рублёў — гэта каля 17 працэнтаў ад кошту кватэры.**

Увогуле сакратарыятам «прамой лініі» было прынята 98 тэлефонных званкоў. На 43 звароты Зянон Ломаць адказаў непасрэдна, а астатнія будуць разгледжаны ў вызначаным парадку. Гэта датычыцца і адрасаваных старшыні Камітэта дзяржкантролю лістоў, якіх, дарэчы, было таксама 98.

Першы званок быў ад жанчыны, у якой дзевяць дзяцей, наконт павелічэння памеру пенсіі. Гэта пытанне да ўрада, аднак работнікі Камітэта дзяржкантролю, сказаў Зянон Ломаць, таксама пастараюцца разабрацца з сутнасцю яе праблемы і дапамагчы.

Зрэшты, большасць праблем, з якімі тэлефанавалі на «прамую лінію», знаходзяцца ў кампетэнцыі мясцовых уладаў. У прыватнасці, у калодзежах жыхароў адной з вёсак каля Ваўкавыска якасць вады не адпавядае санітарным нормам, паколькі на яе негатыўна ўплываюць адходы мясцовай птушкафабрыкі. А прафінансаваць пракладку водаправода сялянам, сярод якіх у асноўным пенсіянеры, не па кішэні.

Маці-адзіночка з пасёлка Наваельня Дзятлаўскага раёна прасіла дапамогі з працаўладкаваннем на, як яна сказала, любую работу.

Жыхарка адной з вёсак звярнулася па пытанні прыватызацыі жылля для шматдзетнай сям'і. Жанчына працуе кухарам у бальніцы, а яе муж, паколькі зарплата ў гаспадарцы малая, стаў працаваць у райцэнтры. І цяпер гаспадарка на дазваляе ім прыватызаваць жыллё.

Жыхар райцэнтра Свіслач лічыць няправільнымі абмежаванні на гандаль прадуктамі, якія раней дастаўляліся з іншых рэгіёнаў Беларусі...

Зянон Ломаць паведаміў, што ніводная просьба не будзе пакінутая без увагі, усе звароты на «прамую лінію» будуць узятыя на жорсткі кантроль. Хаця гэта не значыць, што ўсе пытанні будуць вырашаны. У функцыі Камітэта дзяржкантролю, у прыватнасці, не ўваходзіць разгляд пытанняў, якія знаходзяцца ў кампетэнцыі судовых органаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



## Азёрная раніца

Трохгадовая **Аліна СЕЛЯХ** па прыкладу сваіх бацькоў і старэйшых братоў з ахвотаю загартоўваецца ў азёрнай палонцы. Фотаздымак зроблены ўчора на возеры Бярэжа на ўскраіне Браслава.

На слыху

# ПЕРАНОС АДПАЧЫНКУ — ТОЛЬКІ Ў КРАЙНІМ ВЫПАДКУ

**Праца — амаль год, адпачынак — усяго некалькі тыдняў у год. Тым не менш тэма водпускаў была на слыху заўсёды, і асабліва актуальнай яна стала апошнім часам — пасля змянення айчыннага заканадаўства. Такім чынам, на якіх умовах пераносяцца працоўныя водпускі на наступны год, на колькі частак можна падзяліць адпачынак зараз і хто можа выбіраць яго час? Гэтым і іншым пытанням была прысвечана чарговая on-line канферэнцыя Міністэрства працы і сацыяльнай абароны з удзелам <u>начальніка юрыдычнага ўпраўлення Інэсы Мечыславаўны ЧЫСЦЯКОВАЙ, намесніка начальніка юрыдычнага ўпраўлення Валянціны Уладзіміраўны МАСЛОЎСКАЙ, кансультанта ўпраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы Галіны Філіпаўны ВІЛІВЕЦКАЙ</u> і <u>кансультанта Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Марыны Іванаўны ГРЫШУКЕВІЧ.</u>**

**У мінулым годзе работнік выкарыстаў толькі частку, 15 каляндарных дзён, свайго працоўнага адпачынку. Адсюль цалкам лагічнае пытанне: ці можна «забраць» рэшту сёлета?**

— Паводле 170 артыкула Працоўнага кодэкса, наймальнік абавязаны дазваляць водпуск на працягу кожнага працоўнага года. І толькі ў выключных выпадках, калі гэта можа неспрыяльна адбіцца на дзейнасці арганізацыі, са згоды самога работніка магчымы перанос часткі водпуску на год наступны.

Перанесеная частка водпуску, па жаданні работнікаў, далучаецца да водпуску за наступны год або выкарыстоўваецца асобна. Пры гэтым гаворка ідзе менавіта аб частцы — як мінімум 14 каляндарных дзён работнік мусіць адгуляць менавіта ў бягучым годзе.

Варта памятаць і яшчэ адну асаблівасць заканадаўства. Перанос водпускаў работнікам ва ўзросце да 18 гадоў і дадатковых водпускаў за шкодныя ўмовы працы не дазваляецца.

**Хто выбірае час адпачынку?**

— Працоўныя водпускі (асноўныя і дадатковы) за другі і наступныя гады работы могуць дазваляцца ў любы час паводле прынцыпу чарговасці. Прычым сама чарговасць вызначаецца графікам адпачынкаў, які зацвярджаецца наймальнікам па ўзгадненні з прафкамам або, калі прафкама няма, наймальнікам па ўзгадненні з работнікам.

У той жа час артыкул 168 Працоўнага кодэкса прадугледжвае, што пры складанні графікаў наймальнік абавязаны запланаваць водпуск у летні або іншы зручны для работніка час наступным катэгорыям: асобам ва ўзросце да 18 гадоў, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыі іншых дзяржаў, жанчынам, што маюць двух і больш дзяцей ва ўзросце да 14 гадоў або дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, работнікам, што захварэлі і перанеслі прамянёвую хваробу ў выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, інвалідам-чарнобыльцам, работнікам, якія прымалі ўдзел у ліквідацыі наступстваў катастрофы на ЧАЭС у 1986-1989 гадах у зоне эвакуацыі (адчужэння) або ў 1986-1987 гадах у зонах першачарговага ці наступнага адсялення, работнікам, што былі эвакуяваны або пакінулі самастойна зоны эвакуацыі, першачарговага і наступнага адсялення, грамадзянам, якія маюць знакі «Ганаровы донар Рэспублікі Беларусь», «Ганаровы донар СССР» або «Ганаровы донар таварыства Чырвонага Крыжа БССР», а таксама ў іншых выпадках, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі.

Плюс да таго, некаторыя катэгорыі могуць разлічваць на водпуск у пэўны перыяд. Так, пры жаданні навучэнцы вячэрніх (зменных) агульнаадукацыйных устаноў, навучэнцы прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных устаноў і ВНУ павінны атрымаць водпуск да або ў перыяд праходжання бягучай і выніковай атэстацыі, здачы кандыдацкіх іспытаў, у час вакацый ва ўстанове адукацыі. Муж цяжарнай жонкі можа запатрабаваць дазволу на водпуск у час «дэкрэтнага». Сумяшчальнікі атрымліваюць водпуск адначасова з водпускам па асноўным месцы працы, настаўнікі і выкладчыкі — летам. А жонкі ці мужы вайскоўцаў могуць прэтэндаваць на адначасовы выхад у адпачынак адпаведна са сваім мужам або жонкай.

**Калі магчымы перанос?**

— Графік з'яўляецца абавязковым як для наймальніка, так і для работніка. Аднак у пэўных варунках водпуск можа быць перанесены або працягнуты. Па-першае, гэта магчыма пры часовай непрацаздольнасці работніка. Па-другое, у сувязі з водпускам па цяжарнасці і родах. Па-трэцяе, пры прыцягненні да выканання дзяржаўных абавязкаў з правам вызвалення ад працы. Чацвёртая падстава — супадзенне працоўнага водпуску з водпускам у сувязі з навучаннем, калі работнік аформіў водпуск «на сесію» перад працоўным водпускам або падчас апошняга пасля атрымання выкліку з навучальнай установы.

**(Заканчэнне на 2-й стар.)**

### Прамая лінія

Размеркаванне — не менш адказны час у жыцці маладых людзей, чым прыёмная кампанія. Ці абавязана камісія па размеркаванні задавальняць персанальныя заяўкі арганізацый на выпускнікоў? Ці павінна брацца пад увагу сямейнае становішча выпускніка? Якія прывілеі дае выпускнікам статус маладога спецыяліста? Якія могуць быць падставы для пераразмеркавання? Ці можна апратэставаць вынікі размеркавання? Як размяркоўваюцца выпускнікі магістратуры? На ўсе пытанні, якія датычаца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе завочную «прамую» лінію.

**З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### СНЕГАПАДЫ І ЗАМАРАЗКІ ЎНАЧЫ. ПАЦЯПЛЕЕ ТОЛЬКІ Ў ВЫХАДНЫЯ

**На гэтым тыдні ў Беларусі чакаецца вельмі няўстойлівае надвор'е, таму што ў аўторак на тэрыторыю краіны завітае цыклон з боку Балтыі, паведаміў рэдакцыі <u>начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.</u>**

У аўторак і сераду на большай частцы краіны чакаецца снег і мокры снег, у ноч на сераду па Гомельскай і Магілёўскай абласцях снег моцны, на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў сераду 1—7 марозу, удзень у аўторак ад мінус 1 да плюс 5, у сераду — мінус 2—плюс 3 градусы.

У чацвер—пятніцу атмасферны ціск стане крыху павялічвацца, і ўдзень будзе ўжо больш сонечна. У чацвер месцамі, а ў пятніцу па паўднёвым захадзе зноў чакаецца невялікі мокры снег. Тэмпература паветра ў чацвер уначы мінус 2—8 градусаў, пры праясненнях — да 12 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. У пятніцу ўначы чакаецца 3—10 марозу, па паўночным усходзе — да мінус 13 градусаў, удзень — ад мінус 1 да плюс 5 градусаў.

Згодна з папярэднімі прагнозамі, у выхадныя характар надвор'я істотна зменіцца, і да нас стане паступаць цёплае і вільготнае паветра з боку поўдня Еўропы. Тады ападкі чакаюцца ўжо ў выглядзе дажджу. У асобных раёнах туман, уначы і раніцай месцамі на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы ў суботу ад мінус 5 да плюс 1 градуса, у нядзелю — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, удзень у выхадныя 2—8 цяпла, па поўдні ў нядзелю — да плюс 10 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### УКРАІНЦЫ ЎСЁЙ ВЁСКАЙ СПРАБАВАЛІ «ЎЛАМАЦЬ» БЕЛАРУСКІХ ПАМЕЖНІКАЎ

**Украінцы спрабавалі ўгаварыць двух пагранічнікаў у Столінскім раёне, каб тыя дазволілі незаконна вывезці з Беларусі дровы. Пра гэта расказаў <u>начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Аляксандр ЦІШЧАНКА.</u>**

Кур'ёзная сітуацыя адбылася днём 21 сакавіка на тэрыторы Палескага лясгаса, дзе пры ачыстцы мясцовасці былі высечаны дрэвы і нарыхтаваны дровы. З украінскага боку невядомы спрабаваў дамовіцца з памежным нарадам аб вывазе дроў. Беларускія памежнікі не пайшлі на здзелку з сумленнем і правасуддзем і адмовілі. Але мужчына стаў камусьці тэлефанаваць і ўжо праз некалькі хвілін уздоўж мяжы з боку Украіны стаялі каля 30 чалавек, спрабуючы псіхалагічна націснуць на памежнікаў. «Угаворшчыкі», як мяркуецца, з'яўляюцца жыхарамі вёскі Дроздынь Ратноўскага раёна. Тым не менш угаворы трох дзясяткаў украінцаў не мелі жаданага эфекту, і ім давялося рэціравацца.

**Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.**

### МАРШРУТКА НАЕХАЛА НА ВАЗОК З ДЗІЦЕМ

**У Мінску на вуліцы Шаранговіча маршрутка наехала на дзіцячы вазок, у якім знаходзіўся аднагадовы хлопчык.**

Як паведаміў інспектар аддзела па прапагандзе і агітацыі ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрый Карніевіч, вадзіцель 1961 года нараджэння, кіруючы маршрутным мікрааўтобусам «Селар-3234», на вуліцы Шаранговіча ўчыніў наезд на вазок з дзіцем. Мама з дзіцячым вазком, у якім знаходзіўся аднагадовы хлопчык, пераходзіла дарогу па нерэгулюемым пешаходным пераходзе. Дзіця з чэрапна-мазгавой траўмай лёгкай ступені шпіталізаванае.

Усяго за мінулыя выхадныя ў Мінску зарэгістравана 101 дарожна-транспартнае здарэнне. Затрымана 47 вадзіцеляў, якія кіравалі транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення. За перавышэнне хуткасці прыцягнутыя да адказнасці 398 вадзіцеляў.

**Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».**

### БАБРУЙСК УПРЫГОЖАЦЬ ГРАФІЦІ

**Бабруйскія ўлады абвясцілі конкурс эскізаў у жанры графіці.**

Ініцыятарам конкурсу выступіў аддзел па справах моладзі Бабруйскага гарвыканкама, мэта яго — прыцягненне маладых людзей да творчасці і добраўпарадкавання горада.

Удзел у конкурсе могуць браць удзел усе, каму ад 14 да 31 года. Эскізы прымаюцца да 3 красавіка. Іх тэмамі павінны стаць любоў да роднага Бабруйска, моладзь і здаровы лад жыцця, краіна і сям'я, а таксама ў шырокім сэнсе душа і свет маладых мастакоў.

Па выніках конкурсу адбудзецца выстава. Пераможцы атрымаюць прызы. У аддзеле моладзі таксама заявілі, што лепшыя праекты маладых графіцістаў праз узгадненне з гарадскімі службамі будуць увасоблены ў маштабе ў прамысловых зонах і «шэрых месцах» Бабруйска.

**Ілона ІВАНОВА.**

### НЕДЗІЦЯЧЫЯ ЗАБАВЫ

**У нядзелю 22 сакавіка ў Магілёўскую гарадскую бальніцу з кантузіяй вока звярнуўся і быў шпіталізаваны 9-класнік адной з магілёўскіх школ. Ён паведаміў, што ў лесапасадцы выпрабоўваў саматробны выбуховы пакет, але зрабіў гэта неасцярожна.**

У той жа дзень у Бабруйску ў рэанімацыю дзіцячай бальніцы з вострым атручэннем трапіла 2-гадовая дзяўчынка. Яна засталася без догляду бацькоў, знайшла і з'ела розныя таблеткі.

**Алена КАЗЛОВА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### «ГАЗПРАМ» НАЗВАЎ КОШТ НА ГАЗ ДЛЯ УКРАІНЫ Ў ДРУГІМ КВАРТАЛЕ





**Закупны кошт на расійскі газ для Украіны ў другім квартале 2009 года складзе 280 долараў за тысячу кубаметраў.**

Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні праўлення «Газпрама» Валерый Голубеў. У першым квартале Расія прадавала газ украінскаму боку па 360 долараў за тысячу кубаметраў.

### SPIEGEL: КАМІСІЯ ЕС ПРЫЗНАЛА, ШТО СААКАШВІЛІ БЫЎ ІНІЦЫЯТАРАМ ВАЙНЫ З РАСІЯЙ



**Камісія ЕС, вывучыўшы акалічнасці і ход ваеннага канфлікту з Расіяй у жніўні мінулага года, прыйшла да высновы, што менавіта прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі ініцыяваў баявыя дзеянні. Як чакаецца, даклад камісіі, у якую ўвайшлі дыпламаты, вайскоўцы, гісторыкі і юрысты-міжнароднікі, будзе апублікаваны ў пачатку лета.**

Як піша штотыднёвік Spiegel, камісія прааналізавала перш за ўсё выступленне 7 жніўня 2008 года на нацыянальным ТБ генерала Мамукі Курашвілі, камандзіра дыслакаваных у Паўднёвай Асеціі грузінскіх міратворцаў. Тады Курашвілі заявіў, што Грузія прыняла рашэнне аб «узнаўленні канстытуцыйнага парадку ў рэгіёне».

Паводле звестак Spiegel, камісія лічыць тэлевізійнае выступленне генерала Курашвілі прынцыповым. Прааналізаваўшы выказванні генерала, камісія прыйшла да высновы, што Саакашвілі не адбіваў «расійскую агрэсію», як ён сцвярджае і як вырашыла парламенцкая камісія Грузіі, а планаваў правядзенне баявых дзеянняў. Камісія прызнае і факт, пацверджаны заходнімі назіральнікамі, што ўжо раніцай 7 жніўня на мяжу з Паўднёвай Асеціяй было сцягнута 12 тыс. грузінскіх салдатаў і 75 танкаў. Зрабіць гэта хутка было немагчыма, такім чынам, гэтыя дзеянні ўяўляюцца спланаванай акцыяй.

### УДЗЕЛЬНІКАМ САМІТУ G20 У ЛОНДАНЕ ПРАПАНУЮЦЬ «АНТЫКРЫЗІСНАЕ МЕНЮ»

**Удзельнікаў саміту «вялікай дваццаткі», які мае адбыцца 2 красавіка ў Лондане, дзе будуць абмяркоўвацца шляхі барацьбы з сусветным фінансавым крызісам, падчас дзелавога абеду чакае «антыкрызіснае меню». У яго ўвойдуць простыя стравы брытанскай кухні, прыгатаваныя з недарагіх прадуктаў, паведамляе Sunday Times.**

Як адзначае выданне, тым самым брытанскія арганізатары сустрэчы на найвышэйшым узроўні жадаюць пазбегнуць паўтору сітуацыі, падобнай на тую, што ўзнікла падчас леташняга саміту «вялікай васьмёркі» ў Японіі. Удзельнікам сустрэчы, якія ў ліку іншых тэм абмяркоўвалі праблему недахопу прадуктаў харчавання ў свеце, тады быў пададзены абед, які складаўся з 18 вытанчаных страў: вэнджаны ласось, ікра марскога вожыка, суп з валасатага краба, пуарэ з малочнага баранчыка, лавандавы мёд, а таксама японская ялавічына «вагю» пад чарку сакэ або келіх бургундскага.

Па звестках Sunday Times, для падрыхтоўкі дзелавога банкета на саміце «дваццаткі» брытанскі прэм'ер Гордан Браўн запрасіў маладога, але ўжо даволі папулярнага шэф-кухара Джэймі Олівера (якога ведае і беларускі глядач па праграмах аднаго з каналаў). Гэты кулінар вядомы ў Брытаніі як прапагандыст смачнай, але недарагой і простай у прыгатаванні ежы ў духу нацыянальнай кухні. Меню банкета павінна адлюстроўваць сітуацыю, калі большасць краін свету хвалююць эканамічныя цяжкасці, таму Олівер будзе рыхтаваць з простых прадуктаў, пазбягаючы дарагіх, вытанчаных інгрэдыентаў.

ISSN 1990 - 763X

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.03.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▼ 1 долар ЗША | 2 782,00 |
| ▼ 1 еўра | 3 809,67 |
| 1 латвійскі лат | 5 353,60 |
| 1 літоўскі літ | 1 098,93 |
| 1 чэшская крона | 142,06 |
| 1 польскі злоты | 830,96 |
| ▲ 1 расійскі рубель | 83,54 |
| 1 украінская грыўня | 346,67 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 33,3034 |
| 10 UAH | 41,6293 |
| 1000 BYR | 11,9538 |
| EUR | 45,6323 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

## Бухгалтерский баланс ЗСАО «БелИнгострах» за 2008 год

БелИнгострах

г. Минск, ул. Мясникова, 40, тел. (017) 203 58 78

*тыс. руб.*

| АКТИВ | |
|---|---|
| 1 | 2 |
| Основные средства | 3 968 151,5 |
| Нематериальные активы | 1 456,0 |
| Финансовые вложения — всего | 6 340,0 |
| В том числе: | |
| инвестиции в дочерние общества | 0,0 |
| инвестиции в другие организации | 6 340,0 |
| облигации и другие долговые обязательства | 0,0 |
| прочие финансовые вложения | 0,0 |
| Доля перестраховщиков в страховых резервах | 561 808,4 |
| Дебиторы — всего | 415 864,4 |
| В том числе: | |
| дебиторская задолженность по операциям страхования, сострахования и перестрахования | 194 563,8 |
| депо премий по рискам, принятым в перестрахование | 0,0 |
| дебиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 221 300,6 |
| Прочие активы — всего | 5 125 344,7 |
| В том числе: | |
| незавершенное строительство | 0,0 |
| материальные ценности и затраты | 332 451,8 |
| денежные средства | 4 639 142,9 |
| собственные акции (доли) | 153 750,0 |
| прочие активы | 0,0 |
| Непокрытые убытки прошлых лет | 906 706,9 |
| Непокрытые убытки отчетного года | |
| **БАЛАНС** | **10 985 671,9** |

| ПАССИВ | |
|---|---|
| 3 | 4 |
| Источники собственных средств — всего | 7 742 746,0 |
| В том числе: | |
| уставный фонд | 3 165 750,0 |
| резервный фонд | 105 277,1 |
| добавочный фонд | 3 995 024,1 |
| фонд накопления | 407 626,5 |
| фонд потребления | 20 547,4 |
| целевое финансирование | 0,0 |
| нераспределенная прибыль отчетного года | 27 457,2 |
| нераспределенная прибыль прошлых лет | 21 063,7 |
| Страховые резервы и фонды — всего | 2 928 280,6 |
| В том числе: | |
| страховые резервы | 2 875 459,3 |
| фонд предупредительных (превентивных) мероприятий | 52 821,3 |
| гарантийные фонды | 0,0 |
| Кредиторы — всего | 232 445,7 |
| В том числе: | |
| кредиторская задолженность по операциям страхования, сострахования | 78 063,8 |
| кредиторская задолженность по операциям перестрахования | 79 641,2 |
| депо премий по рискам, переданным в перестрахование | 0,0 |
| заемные средства | 0,0 |
| кредиторская задолженность (кроме операций страхования, сострахования и перестрахования) | 74 740,7 |
| Прочие пассивы | 82 199,6 |
| **БАЛАНС** | **10 985 671,9** |

**АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ**

**Достоверность бухгалтерского баланса и отчета о финансовых результатах подтверждена ОДО «Промаудит».**

Мы провели аудит в соответствии с требованиями республиканских правил аудиторской деятельности. Данные правила обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность ЗСАО «БелИнгострах», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ЗСАО «БелИнгострах» на 1 января 2009 года и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2008 год. При этом совершенные ЗСАО «БелИнгострах» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству.

Специальное разрешение (лицензия) на право осуществления аудиторской деятельности: № 02200/0495307 выдана Министерством финансов Республики Беларусь (решение № 432 от 19 декабря 2008 года) и действительна до 2 февраля 2014 года.

**Директор ОДО «ПРОМАУДИТ»** **А.В. Анисович**

## Отчет о финансовых результатах ЗСАО «БелИнгострах» за 2008 год

*тыс. руб.*

| Наименование показателя | За отчетный период |
|---|---|
| 1 | 3 |
| **I. Страхование жизни** | 0,0 |
| Страховые взносы (премии) | 0,0 |
| Страховые выплаты | 0,0 |
| Изменение резерва по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в гарантийный фонд | 0,0 |
| Расходы на ведение дела | 0,0 |
| Результат от операций по страхованию жизни (+ или -) | 0,0 |
| **II. Страхование иное, чем страхование жизни** | |
| Страховые взносы (премии) нетто-перестрахование | 5 800 189,7 |
| Изменение резерва незаработанной премии — нетто-перестрахование (+ или -) | -1 062 437,0 |
| Оплаченные убытки (страховые выплаты) — нетто-перестрахование | 2 359 407,5 |
| Изменение резервов убытков — нетто-перестрахование (+ или -) | 965 065,4 |
| Изменение других технических резервов (+ или -) | 0,0 |
| Изменение иных страховых резервов (+ или -) | 0,0 |
| Отчисления в фонд предупредительных (превентивных) мероприятий и гарантийные фонды | 119 201,8 |
| Расходы на ведение дела | 2 664 255,3 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, переданным в перестрахование | 226 410,4 |
| Комиссионное вознаграждение и тантьемы по рискам, принятым в перестрахование | 187 690,5 |
| Результат от операций по видам страхования иным, чем страхование жизни (+ или -) | 598 673,4 |
| **III. Прочие доходы и расходы, не отнесенные в разделы I и II** | |
| Операционные доходы | 2 698 034,8 |
| Операционные расходы | 2 347 880,8 |
| Внереализационные доходы | 209 713,9 |
| Внереализационные расходы | 914 109,9 |
| Использовано прибыли | 223 367,7 |
| Нераспределенная прибыль (убытки) отчетного периода (+ или -) | 21 063,7 |

**Генеральный директор** А.К. Хомяков

**Главный бухгалтер** О.И. Курьян

# Открытое акционерное общество «Каскад-93»

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2008 ГОД

### ОАО «КАСКАД-93» г. МИНСК, УЛ. Ф. СКОРИНЫ, 14-226

| Наименование показателя | Единицы измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | миллионов рублей | 27895 | 16009 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | миллионов рублей | 25342 | 13727 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | миллионов рублей | 2553 | 2282 |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | миллионов рублей | 50 | 81 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | миллионов рублей | -445 | -88 |
| Прибыль (убыток) | миллионов рублей | 2158 | 2275 |
| Налоги и сборы, платежи и расходы, производимые из прибыли | миллионов рублей | 728 | 578 |
| Чистая прибыль (убыток) | миллионов рублей | 1430 | 1697 |

*УНН 100016908*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**проводит 4-й открытый аукцион по продаже объектов республиканской собственности 2 апреля 2009 года**

| N п/п | Наименование техники | Местонахождение объекта | Год выпуска | Пробег в км/наработка в м/ч | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1. | Автошасси Урал-43203 шасси № 123428, дв. № 439202 | войсковая часть 22213, г. Барановичи | 1989 | 149111 | 10 000 000 | 1 000 000 |
| 2. | Грузовой Урал-43202 шасси № 034159, дв. № 825086 | войсковая часть 65263, г. Барановичи | 1985 | 97285 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 4. | Грузовой Камаз-53212 шасси № 0043295, дв. № 282939 | войсковая часть 23324, г. Береза | 1988 | 155523 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 5. | грузовой Камаз-43105 шасси № 016033, дв. № 991955 | войсковая часть 29969, г. Барановичи | 1986 | 111965 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 6. | Грузовой Камаз-43106, шасси № 0004879, дв. № 0669605 | войсковая часть 29969, г. Барановичи | 1990 | 132098 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 8. | Самосвал МАЗ-5549 шасси № 155820, дв. № 624885 | войсковая часть 55719, г. Полоцк | 1990 | 282187 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 9. | Грузовой МАЗ-53371 шасси № 3328, дв. № 8917858 | войсковая часть 01313, г. Осиповичи | 1989 | 242898 | 8 000 000 | 800 000 |
| 12. | Автошасси МАЗ-5334 шасси № 95228, дв. № 392070 Кузов-фургон КМ-500 б/н 4 кат. | войсковая часть 30695, г. Брест | 1987 | 104138 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 13. | Грузовой Урал-4320, шасси № 069294, дв. № 025741 | войсковая часть 06752, н.п. Мачулищи | 1987 | 121911 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 14. | Автошасси Краз-257 шасси № 375393, дв. № 1044, КР-1996 г. | войсковая часть 20392, г. Бобруйск | 1980 | 345353 | 10 000 000 | 1 000 000 |
| 15. | Грузовой Краз-250 шасси № КО646919, дв. № 28887 | войсковая часть 20392, г. Бобруйск | 1989 | 122583 | 20 000 000 | 2 000 000 |

**4-й аукцион** состоится в 11.00 **2 апреля 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, 6-й этаж, РУП «Белспецконтракт».

Прием документов на участие в аукционе заканчивается в **17.00 31 марта 2009 г.** по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 2, комн. 604, РУП «Белспецконтракт».

К участию в аукционе допускаются покупатели, оплатившие задаток. Физические лица обязаны предоставить паспорт и заполнить необходимые документы установленного образца. Юридические лица предоставляют необходимый пакет документов.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи 2 апреля 2009 года.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5-ти банковских дней со дня подписания договор купли-продажи.

Денежные средства перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012008660018 в Октябрьском отд. ОАО «БелПСБ» г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, код 357, УНП 101099370. **Без НДС.**

**Справки по тел.: 017 тел./факс 224 88 05, 224 54 15.**

**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.com**

*По ранее проведенным торгам извещения опубликованы в газете «Звязда» 13, 17 февраля 2009 года.*

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже неэксплуатируемого здания складского помещения и прилегающего к нему асфальтобетонного покрытия, расположенного по адресу: г. Гродно, пер. Победы, д. 14**

Частное заготовительно-торговое унитарное предприятие «Заготторг Гродненского облпотребсоюза» (Продавец) совместно с ЧУП «Белкоопроект» Белкоопсоюза (Организатор аукциона) проводят открытый аукцион по продаже неэксплуатируемого здания складского помещения и прилегающего к нему асфальтобетонного покрытия, расположенного по адресу: г. Гродно, пер. Победы, д. 14.

**Характеристика строения:** Складское помещение, введено в эксплуатацию в 1970 году, стены кирпичные, фундамент бетонный, перегородки кирпичные, перекрытия из железобетонных плит, полы бетонные, кровля совмещенная рулонная, оконные проемы – створчатые неостекленные окрашенные, дверные проемы двупольные, внутренняя отделка – не оштукатурено, общая площадь – 355,3 м$^2$, сети отопления, электроснабжения, водоснабжение, канализация отсутствует.

Асфальтобетонное покрытие, однослойное асфальтобетонное покрытие на щебеночном основании, подстилка из песка, 1987 года ввода в эксплуатацию, площадь 949 м$^2$.

Общая площадь земельного участка для содержания и обслуживания зданий и сооружений составляет 1,7500 га. Разделение земельного участка не производилось и будет произведено после продажи в соответствии с действующим законодательством РБ. Земельный участок предоставлен в постоянное пользование по решению Гродненского городского исполнительного комитета от 06.04.2005 года № 206 и от 09.09.2005 года № 513.

Начальная цена составляет 227 774 898 белорусских рублей с НДС.

Размер задатка составляет 5 % от начальной цены, сумма задатка 11 388 745 белорусских рублей перечисляется на расчетный счет организатора аукциона – р/с 3012000003910 в ОАО «АСБ Беларусбанк», филиал 510 МФО 153001603, УНН 100105073 ОКПО 01790429 (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Задаток согласно Условий проведения аукциона № 05-09 от 09.02.2009 г., без НДС»).

**Аукцион состоится 24.04.2009 года в 14.00 по адресу: г. Гродно, переулок Победы, 14.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 23.04.2009 г. включительно с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, пр. Победителей, 17, 12-й этаж, каб. 1211.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Плата за участие в аукционе составляет 257 290 белорусских рублей и перечисляется участниками на расчетный счет организатора аукциона (в платежном поручении в графе «Назначение платежа» указывать: «Плата за участие в аукционе согласно Условий проведения аукциона № 05-09 от 09.02.2009 г., в том числе НДС 18 %).

Вознаграждение организатора аукциона составляет 5 % от продажной стоимости объекта и уплачивается победителем аукциона (помимо оплаты за объект) на расчетный счет организатора аукциона в течение 5-ти банковских дней с даты проведения аукциона.

Для участия в аукционе юридическое лицо, гражданин или индивидуальный предприниматель (лично или через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок обязан предоставить следующие документы в адрес организатора аукциона:

- заявление на участие в аукционе;
- заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора аукциона;
- юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), нотариально удостоверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации;
- заверенную банком копию платежного поручения, подтверждающую внесение платы за участие в аукционе в размере 257 290 белорусских рублей;
- индивидуальным предпринимателем – нотариально удостоверенную копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык;
- представителем физического лица – резидента Республики Беларусь – нотариально заверенную доверенность, паспорт;
- физическим лицом – паспорт.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона. Право собственности на объект переходит от Гродненского облпотребсоюза к победителю аукциона после полного расчета по договору купли-продажи объекта.

Объект продается без условий.

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектом.

**Контактные телефоны: в Минске — (8017) 226 94 83, 226 78 84; 8 (029) 775 40 73, 8 (029) 681 27 97, в Гродно (80152) 56 57 54**

# КЕМЛІВЫ КАНТРАЛЁР

**Паўтары-дзве тысячы расійскіх рублёў — у такую суму была ацэнена фальшывая адзнака ў пашпарце і міграцыйнай карце, якую ставіў 22-гадовы беларускі кантралёр аддзела памежнага кантролю «Новая Гута» ў дакументах гастарбайтараў з Сярэдняй Азіі, якія працуюць у Расіі.**

Сутнасць у тым, што па расійскіх законах замежныя грамадзяне, якія працуюць на тэрыторыі РФ, праз пэўны тэрмін павінны працягваць час рэгістрацыі. Калі рабіць усё па законе, трэба спачатку пакінуць краіну, а потым наноў у яе ўехаць. Пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца адзнакі аб перасячэнні мяжы ў пашпарце і міграцыйнай картцы. Прыдатныя таксама і адзнакі аб перасячэнні дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь, з якой у расіян адзіная мытная прастора.

Як зрабіць з гэтай сітуацыі прыбытковы бізнэс, скеміў малады супрацоўнік памежнай службы. На працягу двух месяцаў ён разгарнуў даволі маштабную дзейнасць. Яго кліенты карысталіся паслугамі «ганца», які перадаваў дакументы пачкамі адной з супрацоўніц страхавых органаў, што звычайна дзяжураць у пунктах пропуску. Тая, у сваю чаргу, везла паперы штампаваць у Гомель. Фіктыўныя адзнакі кантралёр рабіў падробленымі клішэ-нумаратарамі.

Па інфармацыі Камітэта дзяржбяспекі, за два месяцы малады чалавек дапамог атрымаць фальшывую рэгістрацыю ў Расіі больш чым 150 гастарбайтарам. Апошнія адбіткі ў партыі пашпартоў грамадзян Узбекістана за агульную суму 19,5 тысячы расійскіх рублёў былі пастаўлены на мінулым тыдні. Бізнэс памежніка-прадпрымальніка сумеснымі намаганнямі прыпынілі супрацоўнікі органаў памежнай службы і УКДБ па Гомельскай вобласці. У дачыненні да кантралёра і адной з найбольш актыўных яго памагатых — супрацоўніцы страхавой арганізацыі — узбуджана крымінальная справа па артыкуле «Махлярства, здзейсненае групай асобаў», які прадугледжвае да пяці гадоў пазбаўлення волі. Цікава, што калі б малады чалавек адзначаў дакументы сапраўдным штэмпелем, пакаранне было б іншым — па артыкуле за выкарыстанне службовага становішча.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## «ПАГАРЭЛІ» НА КАМАНДЗІРОВАЧНЫХ

Чацвёра службовых асобаў з Баранавіцкага раёна наведалі з рабочым візітам раён-пабрацім у Расіі. Потым здалі справаздачы па камандзіровачных выдатках. Але ў кампетэнтных органаў выклікалі падазрэнне квітанцыі аб аплаце пражывання. Пракуратура палічыла пададзеныя дакументы «ліпавымі», а ўдзельнікі паездкі падазраюцца ў прысваенні прыкладна 600 тысяч рублёў кожны. Цяпер кіраўніку раённай прадстаўнічай улады, аднаму з намеснікаў старшыні райвыканкама, кіраўнікам спажыўсаюза і лясгаса давядзецца даказваць адваротнае альбо несці адказнасць па законе.

**Яна СВЕТАВА.**

# ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

**24 апреля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион по продаже объектов, находящихся в государственной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания с установлением начальной цены продажи каждого объекта, равной одной базовой величине, которые составляют единые предметы аукциона**

**На аукционные торги выставляются:**

| Предмет аукциона, местоположение недвижимого имущества | Начальная цена недвижимого имущества / права аренды земельного участка, рублей / Сумма задатка для участия в аукционе, рублей | Характеристика недвижимого имущества | Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества / Условия использования земельного участка |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1:** Не завершенное строительством капитальное строение – здание детского сада, расположенное по адресу: Минская область, Смолевичский районе, д. Барсуки, находящееся в республиканской собственности | Одна базовая величина, установленная на дату проведения аукциона / 4 107 800 Сумма задатка – 400 000 | Фундамент – бетонные блоки, стены и перегородки кирпичные, перекрытия железобетонные. Степень готовности 42 %, двухэтажное, общая площадь строения 1782,1 кв. м. Строительство велось в период с 1988 по 1990 гг. | Срок аренды земельного участка – 99 лет, площадь 0,4762 га. Введено ограничение в использовании земельного участка в связи с расположением его в охранных зонах канализации и подземных кабелей электропередачи. **Условия использования**: для размещения объектов общественного, жилого, административного, физкультурно-оздоровительного назначения. |
| **Условиями использования объекта по лоту № 1 являются:** осуществление покупателем предпринимательской деятельности на данном объекте; создание покупателем не менее 3-х рабочих мест; запрещена продажа покупателем, иное отчуждение объекта до выполнения им условий договора купли-продажи. | | | |
**Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают:** заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: юридическими лицами (резиденты РБ) – доверенность, выданная представителю юридического лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; индивидуальными предпринимателями – копия свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования; представителям индивидуальных предпринимателей – нотариально удостоверенная доверенность; юридическими лицами (нерезиденты РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представитель иностранного юридического лица дополнительно представляет легализированную в установленном порядке доверенность. При подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, последний день приема документов 21 апреля 2009 г. до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. Правды, 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 25 апреля 2009 г. с 14.00 до 14.45.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

5. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

**6. Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации земельного участка и затраты на подготовку и проведение аукциона в сумме 5 миллионов рублей (по каждому лоту); внести плату за право заключения договора аренды земельного участка; не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка заключить с арендодателем договор аренды земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

**8. Контактный телефон в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, E-mail:votfondgi@tut.by.**

**Контактные телефоны: в г. Глубокое (02156) 2 19 37, в г. Городке (02139) 4 08 95, 4 11 34, в г. Лепеле (02132) 4 14 74, в г. Докшицы (02157) 2 16 73.**

**Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)**

**проводит открытый аукцион по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:**

**лот № 1** — земельный участок в а/городке Раков, площадь участка — 0,1540 га, участок № 4, начальная цена 15 400 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома. Проектируется центральное водоснабжение, имеется в непосредственной близости газ; **лот № 2** — земельный участок в деревне Пережери, площадь участка — 0,2212 га, начальная цена 11 060 000 белорусских рублей. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание жилого дома.

Удаленность от центра агрогородка Раков 5 километров, находится на окраине населенного пункта, гравийно-асфальтированный подъезд, имеется возможность подключения электричества.

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется квитанцией в Главное управление МФ РБ по Минской области, р/с 3600614140152 в филиале № 605 МОУ АСБ «Беларусбанк», код 513, г. Воложин, ул. Партизанская, 13, УНП 600537220, назначение платежа 04901.

Аукцион состоится **24 апреля 2009 года в 10.00** по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-й этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до **21 апреля 2009 года** (включительно) до **17.00** по адресу: а/г Раков, пл. Свободы, 11, кабинет секретаря.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36, 8 029 1405437.**

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, футболкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь» і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 красавіка 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 красавіка 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 04.03.09 па 10.04.09.

**Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 сакавіка 2009 года. Удачы ў гульні!**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1339 ад 03.03.09 выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

### 5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________________ **на II кв. або 1–е паўг. 2009 года**

**Хатні адрас і тэлефон** [ ] ____________________
(індэкс)

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету

(індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

| Кошт | падпіскі | ______ руб. | Колькасць камплектаў | |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | ______ руб. | | |

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму
(прозвішча, ініцыялы)
Куды
(адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

# Краіна здароўя

Выпуск № 10 (124)

## Доктар адкажа

### Ёсць пытанні? Тэлефануйце...

**Да канца сакавіка дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**24 сакавіка** — галоўны ўрач Рэспубліканскай клінічнай бальніцы паталогіі слыху, голасу і маўлення Людміла Эдуардаўна МАКАРЫНА-КІБАК.

**25 сакавіка** — галоўны ўрач Мінскага абласнога супрацьтуберкулёзнага дыспансэра Андрэй Пятровіч МІЦЬКО.

**26 сакавіка** — намеснік галоўнага ўрача Рэспубліканскай клінічнай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі Уладзімір Васільевіч ЗАЗЫБА.

**27 сакавіка** — намеснік дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Рышард Рамуальдавіч СІДАРОВІЧ.

**30 сакавіка** — начальнік аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Таццяна Фёдараўна МІГАЛЬ.

**31 сакавіка** — начальнік упраўлення медстатыстыкі, інфармацыйных тэхналогій і справаводства Барыс Мікалаевіч АНДРАСЮК.

*У графіку магчымыя змяненні.*




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Лунінецкая дзятва і яе вясновыя забавы.

## Сельскія медыкі, але гарадскія жыхары

**Магілёўскі гарвыканкам кампенсуе кошт праезду медыкам, якія жывуць у абласным цэнтры, але працуюць ва ўстановах аховы здароўя Магілёўскага раёна.**

Гэта рашэнне ўладаў паспрыяе замацаванню кадраў у вёсцы. Асабліва гэта датычыцца маладых медыкаў, якія атрымліваюць працоўныя месцы па-за межамі горада. Праезд да вёсак вымагае не толькі часу, але і каштуе нятанна. Тым больш што медыцынскія ўстановы ў вёсках працуюць і па суботах. Калі б вялікую частку заробку даводзілася выдаткоўваць на транспарт, тады наўрад ці магіляўчане працавалі б у аддаленых ФАПах.

— Так, кампенсацыя праезду неабходна, і гэта заўсёды робіцца, — пацвердзіў галоўны ўрач магілёўскай паліклінікі № 11 Сяргей Караеў, які курыруе ахову здароўя Магілёўскага раёна. — Але ўсё ж лепей, калі доктар і фельчар жывуць побач са сваёй установай, таму што ў такім разе сяляне могуць атрымаць медыцынскую дапамогу кругласутачна. У нас такіх — большасць. Напрыклад, з пяці ўчастковых бальніц у раёне толькі адзін ўрач ездзіць з Магілёва. Гарадская моладзь пачынае са штодзённых паездак з горада да месца працы, а потым застаецца жыць у вёсцы, калі дапамагаюць з жыллём. Такія выпадкі ў нас ёсць.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «ГРЫПОЗНАЯ ХВАЛЯ» ПАКІДАЕ БЕЛАРУСЬ

20 сакавіка ў сувязі з устойлівым зніжэннем захваральнасці мінчан на грып і прастуду да неэпідэмічнага ўзроўню, у сталіцы былі адмененыя супрацьэпідэмічныя мерапрыемствы, уведзеныя яшчэ 29 студзеня. Спецыялісты канстатуюць, што сёлетняя эпідэмія была зацяжной і затрымалася ў Мінску на 7 тыдняў. А ўсяго за час эпідэміі ахвярамі прастуды сталі 241,5 тысячы чалавек (гэта 13 працэнтаў ад агульнай колькасці жыхароў горада). Дзеці ва ўзросце да 14 гадоў склалі 42 працэнты ад агульнай колькасці тых, хто захварэў. Шпіталізаваны ў стацыянары былі 2,3 тысячы чалавек. На канец мінулага тыдня перавышэнне эпідэмічных парогаў назіралася толькі ў Віцебску, Наваполацку, якія «загрыпавалі» апошнімі, і ў Салігорску.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Мужчыны, увага!

## КЛІМАКС — ГЭТА І ВАША ПРАБЛЕМА

**Многія праявы мужчынскага клімаксу (андрапаўзы) падобныя на жаночыя, але ёсць і нямала адрозненняў. Па-першае, у жанчын клімакс настае прыкладна ў адным узросце — каля 50 гадоў. Па-другое, ёсць вельмі яскравы паказчык — спыненне менструацыі. Па-трэцяе, ячнікі перастаюць сінтэзаваць жаночыя гармоны — эстрагены. У мужчын жа карціна больш стракатая. Узроставая разбежка можа быць даволі вялікай. Сінтэз гармонаў не спыняецца, а толькі зніжаецца. Праяўляецца андрапаўза не ва ўсіх прадстаўнікоў моцнай паловы, а толькі ў 10—20 працэнтаў. І яшчэ адна адметнасць. Калі ў жанчын з прыходам клімаксу рэпрадукцыйная функцыя згортваецца, дык у мужчын такога рэзкага «абрыву» не адбываецца.**

Андрапаўза — не хвароба, а пэўны стан мужчынскага арганізма, натуральны пераход ад сталасці да старасці, які абумоўлены зніжэннем узроўню андрагенаў (мужчынскіх палавых гармонаў), у першую чаргу, тэстастэрону. (У сувязі з гэтым спецыялісты шырока выкарыстоўваюць яшчэ адзін тэрмін «узроставы андрагенны дэфіцыт».) У той момант, калі ўзровень тэстастэрону робіцца значна ніжэйшым за норму, арганізм мужчыны рэагуе на гэта рознымі парушэннямі.

**Тэстастэрон** («кароль гармонаў», гармон каралёў») — галоўны мужчынскі гармон, які выпрацоўваецца ячкамі і наднырачнікамі, адказвае за рост і развіццё палавых органаў, вызначае лібіда, палавую актыўнасць, актывізуе абмен рэчываў і іншыя працэсы.

Звычайна клімакс у мужчын праяўляецца пасля 50 гадоў, аднак першыя сімптомы могуць з'явіцца значна раней — у 40—45. Вучоныя высвецілі, што частата клімактэрычных парушэнняў, а таксама выпадкаў іх ранняга ўзнікнення значна вышэйшая сярод асобаў, якія падвяргаюцца ўздзеянню прафесійных і побытавых негатыўных фактараў. Ненармаваны працоўны дзень, хранічны стрэс, сістэматычнае перагрэванне або пераахаладжэнне, уздзеянне іанізуючай радыяцыі, вібрацыя, шум з'яўляюцца дадатковымі фактарамі, якія садзейнічаюць развіццю клімаксу.

Як адзначалася вышэй, у мужчын гармональная перабудова праходзіць плаўна. Найбольш высокі ўзровень тэстастэрону назіраецца ў 25—30 гадоў. Затым ён пачынае зніжацца прыкладна на 1—2 працэнты ў год і бліжэй да 80-ці складае ў сярэднім каля 40 працэнтаў ад нармальнага ўзроўню гармону для 25-гадовага мужчыны. Узровень тэстастэрону неаднолькавы ў розных людзей аднаго і таго ж узросту. Уплываюць на гэта такія фактары, як лад жыцця, хранічныя захворванні, генетычныя і канстытуцыянальныя асаблівасці, шкодныя звычкі.

Пры дэфіцыце тэстастэрону некаторыя прадстаўнікі моцнага полу пачынаюць скардзіцца на «прылівы», патлівасць, пачашчанае сэрцабіцце, галавакружэнне. У іх перыядычна скача артэрыяльны ціск; з'яўляюцца раздражняльнасць, нервознасць, бяссонніца; пагаршаецца памяць і здольнасць канцэнтраваць думкі; зніжаецца шчыльнасць касцявой тканкі, што садзейнічае ўзнікненню пераломаў; змяншаецца мышачная сіла, развіваецца атлусценне. Але больш за ўсё мужчыны перажываюць з-за зніжэння патэнцыі. Спачатку гэта толькі эпізадычнае змяншэнне палавой цягі, аслабленне эрэкцыі. Аднак пасля 2-3 «няўдач» мужчына, як правіла, спыняе палавое жыццё. А гэта, у сваю чаргу, яшчэ больш тармозіць выпрацоўку гармонаў. Атрымліваецца замкнёнае кола: мужчына, які яшчэ здольны да паўнацэннага сэксуальнага жыцця, сам сябе пазбаўляе яго.

З гэтымі непрыемнымі праявамі можна і трэба змагацца. Сучасная медыцына ў стане эфектыўна ўздзейнічаць як на прычыны, так і на наступствы мужчынскага клімаксу, змяншаць іх шкодны ўплыў на арганізм і амаль цалкам аднавіць яго нармальнае функцыянаванне. Таму пры з'яўленні вышэйпералічаных сімптомаў не адкладайце візіт да доктара. Ён правядзе абследаванне і прызначыць неабходнае лячэнне, сутнасць якога — даць арганізму тое, чаго не хапае — дадатковую дозу гармону.

Спецыялісты адзначаюць: немагчыма пазбегнуць клімаксу, але яго можна адтэрмінаваць. Каб дапамагчы арганізму аднавіцца, часам бывае дастаткова ўпарадкаваць рэжым дня, нармалізаваць псіхалагічны настрой, прайсці некалькі сеансаў масажу прастаты, фізіятэрапіі і г.д. Вось толькі некалькі простых парад.

● Строга кантралюйце вагу: атлусценне прыводзіць да закупоркі сасудаў і пагражае развіццём інфаркту, інсульту, трамбозу. Ваш рацыён павінен складацца пераважна з бялкоў (малако, тварог, ялавічына, белае курынае мяса, яйкі, грыбы) і складаных вугляводаў (вотруб'евы хлеб, крупы, бабовыя, агародніна), аднак не забывайцеся і на тлушчы (вяршкі, сыр, арэхі, аліва, тлустыя гатункі рыбы), бо тэстастэрон сінтэзуецца з халестэрыну.

● Захоўвайце мускулатуру ў тонусе. Вельмі карысныя пешыя прагулкі, пад'ёмы па лесвіцы, язда на веласіпедзе і — як ні банальна гучыць — звычайная ранішняя гімнастыка.

● Пераглядзьце лад жыцця. Фізічнае перанапружанне, стомленасць, недасыпанне — на гэта не варта закрываць вочы. Кар'ерны рост несумяшчальны са здароўем. Курэнне і злоўжыванне алкаголем таксама ўтойваюць сур'ёзную небяспеку, прычым не толькі для патэнцыі, — яны літаральна знішчаюць арганізм.

● Старайцеся падтрымліваць разумовую дзейнасць на належным узроўні — шмат чытайце, разгадвайце крыжаванкі, бярыцеся за цяжкія задачы, для рашэння якіх трэба добра «паварушыць мазгамі».

● Захаваць здароўе і мужчынскую сілу дапамогуць спецыяльныя вітамінныя комплексы. Вучонымі даказана, што найбольш карысныя для мужчын вітаміны — С, Е і большасць вітамінаў групы В, а таксама мікраэлементы — селен, магній, цынк. Звярніце ўвагу і на прыродныя стымулятары: жэньшэнь, залаты корань, кітайскі лімоннік.

● Ні ў якім разе не адмаўляйцеся ад сэксу. На думку сэксолагаў, рэгулярныя інтымныя кантакты — самы здаровы і прыемны спосаб захавання маладосці на доўгія гады.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

**ВЫПІСВАЙЦЕ «ЗВЯЗДУ» НА II КВАРТАЛ 2009 ГОДА З БЯСПЛАТНЫМІ ЎКЛАДКАМІ**

Местное самоуправление · Свая справа · Жыландоля · Чырвоная змена · Купі лепшае! Тавары, паслугі, цэны · Краіна здароўя

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 10 120 рублёў на месяц<br>30 360 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 9 570 рублёў на месяц<br>28 710 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 16 170 рублёў на месяц<br>48 510 рублёў на квартал |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 14 740 рублёў на месяц<br>44 220 рублёў на квартал |

ПАДПІСКА «ДА ЗАПАТРАБАВАННЯ» (праз кіёскі Мінгарсаюздруку)

| | | |
|---|---|---|
| ДЛЯ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63850 | 8 690 рублёў на месяц<br>26 070 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕТЭРАНАЎ ВАВ І ПЕНСІЯНЕРАЎ | 63145 | 8 180 рублёў на месяц<br>24 540 рублёў на квартал |
| ДЛЯ ВЕДАМАСНЫХ ПАДПІСЧЫКАЎ | 63858 | 11 640 рублёў на месяц<br>34 920 рублёў на квартал |
| ВЕДАМАСНАЯ ПАДПІСКА ДЛЯ ЎСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ, МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І МІНІСТЭРСТВА АХОВЫ ЗДАРОЎЯ | 63239 | 11 010 рублёў на месяц<br>33 030 рублёў на квартал |

Інфекцыя пад кантролем

## Палачка Коха на волі

### Ужыванне супрацьтуберкулёзных прэпаратаў цяпер ажыццяўляецца пад кантролем спецыялістаў

**Яшчэ дзесяць гадоў таму туберкулёз лічыўся больш сацыяльным, чым інфекцыйным захворваннем. Сёння ў нашай краіне сітуацыя выглядае з дакладнасцю да наадварот.**

У сярэдзіне XX стагоддзя меркавалася, што да 2000 года туберкулёз будзе не проста рэдкім, а надзвычай рэдкім. Што называецца, адзін выпадак на мільён. Аднак прагноз не спраўдзіўся. Па выніках сусветных статыстычных звестак, туберкулёз не толькі не стаў рэдкім, але настойліва працягвае прырастаць. Згодна з цяперашнімі прагнозамі, меркуецца, што да 2020 года, нягледзячы нават на шэраг неверагодных намаганняў, якія робяцца ва ўсім свеце, туберкулёз застанецца досыць распаўсюджаным захворваннем у нашай папуляцыі.

Не так даўно лічылася, і гэта было, у прынцыпе, цалкам апраўдана, што асноўнымі носьбітамі палачкі Коха і хворымі на туберкулёз з'яўляюцца «жыхары» пенітэнцыярнай сістэмы. Сапраўды, у зняволенні захваральнасць вышэйшая дзесьці ў 7-8 разоў. Аднак трэцяя частка ўсіх падобных выпадкаў была зафіксавана ў навічкоў — тых, хто толькі прыйшоў з волі. Каля паловы ўсіх выпадкаў выяўленага ў апошнія гады небяспечнага захворвання прыпадае на так званыя «групы рызыкі» — асобаў, якія нідзе не працуюць, ВІЧ-інфіцыраваных, зняволеных, хранічных алкаголікаў і нават медработнікаў.

У свеце туберкулёз сапраўды ў большай ступені распаўсюджаны сярод народаў Афрыкі, Азіі і Індыі — там, дзе ўладараць галеча і голад, дзе ёсць сэнс гаварыць пра нейкую больш высокую рызыку для цэлых краін. Аднак у той жа Еўропе гэта захворванне на 40 працэнтаў абавязана сваім існаваннем такой звычцы, як курэнне. І гэта ўжо робіць немэтазгодным разважаць пра рызыку ў пэўных групах.

**Захворванне, ад якога загінула больш за ўсё людзей у гісторыі чалавецтва.**

Ва ўзросце да 7 гадоў палачкай Коха інфіцыравана каля паловы дзіцячага насельніцтва. Бліжэй да 40 гадоў — 80-90 працэнтаў. Аднак быць носьбітам палачкі і хворым на туберкулёз — не адно і тое ж. Так, калі ў глабальным сэнсе бацыламі туберкулёзу інфіцыравана трэць чалавецтва, то захварэе актыўнай формай толькі адзін з дзесяці чалавек.

Паводле слоў загадчыка кафедры фтызіяпульманалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдата медыцынскіх навук Паўла КРЫВАНОСА, цяпер у нашай краіне зарэгістравана 12,8 тысячы хворых. Упершыню штогод выяўляецца 5 тысяч новых выпадкаў захворвання.

— Ці можна заразіцца на туберкулёз у маршрутным аўтобусе? — разважае Павел Сцяпанавіч. — Практычна немагчыма. Для заражэння неабходны цесны бытавы кантакт. З аднаго боку, туберкулёз перадаецца вельмі лёгка — паветрана-кропельным шляхам, пры чханні, кашлянні, нават размове... Але з другога боку, мае значэнне і колькасць такіх кантактаў, і «трываласць» імунітэту неінфіцыраванага чалавека...

Можна было б падумаць, што часцей туберкулёз распаўсюджваецца сярод гарадскіх жыхароў — з-за больш небяспечнай экалагічнай сітуацыі, напрыклад. Але насамрэч больш пакутуюць сельскія жыхары. Па розных прычынах — з-за больш сталага ўзросту, не лепшай даступнасці і якасці медыцынскіх паслуг і г.д. Самая высокая захваральнасць па рэспубліцы была і захоўваецца ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях.

Выявіць туберкулёз дапамагаюць сёння некалькі відаў абследавання — бактэрыяскапія (мазок макроты) і рэнтгеналагічнае даследаванне. Што датычыцца першага, то тут вельмі важна вытрымліваць тэхналогію даследавання. Адносна апошняга таксама не ўсё так проста. Практыка паказвае: на тую ж флюараграфію трапляюць фактычна адны і тыя ж здаровыя людзі. Акрамя таго, вызначана, што да 30 працэнтаў здымкаў могуць па-рознаму трактавацца спецыялістамі.

Безумоўна, большую ўвагу неабходна надаваць выбарачным даследаванням усё тых жа груп рызыкі. А тут многае залежыць ад тэрапеўта на першасным прыёме.

— Сёння выявіць туберкулёз — мала, — кажа Павел Крыванос. — Неабходна яго вылечыць. Але як пераканаць у неабходнасці лячэння, калі захворванне фактычна ніяк не праяўляецца, калі хвораму нічога не баліць амаль да самага апошняга дня? Шэраг людзей, асабліва з ліку ўразлівых у дачыненні да туберкулёзу груп, не хочуць лячыцца. Да 30 працэнтаў хворых пакідаюць стацыянар самавольна або іх выпісваюць з-за невытрымлівання нормаў паводзінаў. Сапраўды, само лячэнне — нялёгкае. Неабходна працяглы час, часам нават больш за год, прымаць шэраг лекавых прэпаратаў. Некаторыя з іх досыць таксічныя, маюць пабочныя эфекты. Калі ж хворы лечыцца нерэгулярна або наогул перарывае лячэнне, гэта ў значнай ступені спрыяе развіццю мультырэзістэнтнага туберкулёзу, множнай лекавай устойлівасці. У такіх хворых шанц на вылечванне значна ніжэйшы...

З 2007 года ў нашай краіне рэалізуецца праект Праграмы развіцця Арганізацыі Аб'яднаных нацый «Падтрымка Дзяржаўнай праграмы «Туберкулёз» у Рэспубліцы Беларусь». У межах гэтага праекта сур'ёзная ўвага будзе нададзена спецыяльнай стратэгіі DOTS, якая ўжо ўкараняе лячэнне пад кантролем.

— У нас ёсць праблема з ажыццяўленнем лячэння, — тлумачыць кіраўнік вышэйзгаданага праекта ПРААН Ларыса САВІШЧАВА. — Некаторыя хворыя толькі робяць выгляд, што праглынулі прэпарат, а насамрэч проста пазбаўляюцца яго. Цяпер мы будзем займацца не толькі закупкай належных прэпаратаў, але і арганізацыяй кантролю за ўжываннем апошніх хворымі... Дапусцім, у чалавека выявілі туберкулёз. Яму абавязкова патрэбна шпіталізацыя. Лекі, якія яму прапіша доктар, хворы будзе прымаць непасрэдна ў прысутнасці медперсаналу — медсястры, у абавязкі якой будзе ўваходзіць падобны нагляд. Пад наглядам хвораму давядзецца прымаць лекі і на амбулаторным этапе лячэння. З гэтай мэтай ён павінен будзе штодня наведваць супрацьтуберкулёзны дыспансэр. Некаторым спецыялісты будуць прывозіць лекі дадому. Для такіх мэтаў мы ўжо закупілі на рэспубліку 9 аўтамабіляў. Каб «зацікавіць» у правядзенні лячэння складаныя катэгорыі грамадзян, будзем забяспечваць іх сацыяльнай падтрымкай — харчовымі наборамі і аплатай праезду на транспарце... Цяпер на сацыяльнай падтрымцы ў рэспубліцы знаходзіцца 1370 хворых на туберкулёз.

Застаецца дадаць, што на сённяшні дзень у свеце распрацоўваюцца і новыя вакцыны, і новыя прэпараты для лячэння туберкулёзу. Пакуль жа мы карыстаемся напрацоўкамі мінулых дзесяцігоддзяў. Доўгі час фармацэўтычныя кампаніі, на жаль, не надавалі распрацоўцы антыбіётыкаў супраць туберкулёзу асаблівага значэння. За гэты час мікабактэрыя не раз змянялася і стала досыць устойлівай да старой «хіміі». Спадзяваецца на вынаходніцтва такога прэпарата, які раз і назаўжды вырашыць праблему туберкулёзу, пакуль не даводзіцца.

Тым не менш, выкарыстанне стратэгіі DOTS павінна знізіць захваральнасць на туберкулёз з 54 да 49 на 100 тысяч насельніцтва да 2012 года. Паказчык паспяховага лячэння павінен вырасці да таго моманту з 74 да 85 працэнтаў. Гэта вельмі добры вынік, калі ўлічыць, што ад 5 да 15 працэнтаў хворых з'яўляюцца мультырэзістэнтнымі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Сітуацыя

## «КРЫВАВЫ» ЗАРОБАК?

**Пра небяспеку здачы крыві я ўпершыню задумалася, калі мая знаёмая ледзь не страціла прытомнасць на тралейбусным прыпынку. Пакуль мы чакалі хуткую, дзяўчына распавяла, што не так даўно здавала кроў, а зараз у яе пачаўся менструальны цыкл, і напэўна гэта ўсё з-за рэзкай страты крыві. Урачы хуткай пацвердзілі нашу здагадку...**

### Грошы па венах

Донарства стала спосабам заробку даўно. Яшчэ дваццаць пяць гадоў таму мая матуля і тата пастаянна здавалі кроў, калі трэба было хоць неяк дацягнуць да стыпендыі. Сітуацыя сёння не нашмат адрозніваецца ад той. Многія сённяшнія маладыя людзі таксама не супраць атрымаць 68 000 рублёў і два дні вызвалення ад вучобы.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

8.30. Станцыя пералівання крыві. У невялікім памяшканні — каля сарака чалавек. З іх толькі чатыры жанчыны. Астатнія — маладыя людзі, сярэдні ўзрост якіх ад 20 да 27 гадоў. Ёсць і больш сталыя, але іх не так шмат, чатыры чалавекі.

Прысаджваюся каля двух юнакоў. Пяцікурснікі БАТУ, яны трэці раз здаюць кроў.

— Ну-у-у, — адказвае хлапец на маё пытанне — навошта? — каб вызваленне ад заняткаў атрымаць і грошай зарабіць.

— Гэта ў асноўным. А вось кошты з лета не мяняліся. Даўно б ужо трэба было падняць, — кажа другі. — Ну, і хворым мы, вядома ж, дапамагаем, — дадае, падумаўшы, хлапец.

Людзей прыбывае. Гардэробшчыца станцыі кажа, што самыя напружаныя дні для яе — чацвер і пятніца:

— Ой, у мінулую пятніцу было 70 чалавек за дзень. А што перад святамі рабілася, перад Восьмым і Дваццаць трэцім... Тут проста не прайсці было. Вы, дзяўчына, калі хочаце хутка здаць, то лепш у панядзелак. У нас там звычайна па 15-20 чалавек у дзень, больш не бывае.

Медсястра зачытвае прозвішчы са спісу, маладыя людзі падымаюцца, праходзяць да буфета, дзе ім выдаюць строга па нарматыве па сто грамаў пячэння і вафляў, кубак гарбаты з цукрам і лімонам. Усё гэта неабходна для таго, каб арганізм мог нармальна працаваць і пасля страты 475 мілілітраў крыві (25 на аналіз і 450 сама здача).

Зарабіць на крыві можна ад 68 000 (донары крыві) да 123 750 (донары плазмы). Прычым калі кроў можна здаваць толькі праз два месяцы, плазму бяруць праз кожныя два тыдні. Сума прывязаная да мінімальнай базавай велічыні, якая складае зараз 35 000. Гэта не плата непасрэдна за кроў, а кампенсацыя двух прапушчаных дзён на працы. Калі донар — працоўны і яго сярэднядзённы заробак большы, чым кампенсацыя за адзін дзень, то яму належыць даплата. Студэнтам, якія атрымоўваюць стыпендыю, даплачваецца 25 % на працягу трох месяцаў. Калі ўсур'ёз заняцца здачай крыві, то ў месяц можна атрымліваць ад 34 000 да 247 000. Плюс даплаты.

Але ці так усё ружова і бясхмарна ў «крывавым» заробку?

### Гандаль здароўем

— Як толькі чалавек здаў кроў, арганізм, з улікам таго, што гэта дасканалая аўтаматычная структура, пачынае кампенсаваць гэтую страту, — расказвае **Збышак ПАБЯРЭЖЫН, галоўны ўрач установы аховы здароўя «Станцыя пералівання крыві»**. — Адразу пачынае ўзнаўляцца аб'ём вадкасці, якую страціў арганізм, паступова пачынаюць узнаўляцца крывяныя клеткі, эрытрацыты, лейкацыты і г.д. Калі вадкасць здаровы арганізм можа ўзнавіць за суткі, то на ўзнаўленне клетак патрэбна больш часу, лейкацыты ўзнаўляюцца хутка, трамбацыты крыху павольней. Эрытрацыты ўвогуле праз 60 дзён. Таму і кроў можна здаваць не часцей за адзін раз у два месяцы. Для таго, каб кроў магла нармальна ўзнаўляцца, павінна быць паўнацэннае правільнае харчаванне. Пакуль ідзе ўзнаўленне, трэба ўжываць больш вітамінаў і лепш за ўсё жывёльнага паходжання, а таксама жывёльных бялкоў. Гэта нятлустыя віды мяса: ялавічына, мяса труса, курыцы, а таксама рыба. З улікам таго, што арганізм свабодна кампенсуе тую вадкую частку крыві, бялкі і клетачны склад за два месяцы, то гэта для абсалютна здаровага чалавека не шкодна. З іншага боку, калі ў каго павышаны ціск, рэгулярная здача крыві дазваляе нармалізаваць паказчыкі артэрыяльнага ціску. Такія людзі менш карыстаюцца лекамі. Тыя, хто прытрымліваецца здаровага ладу жыцця, расказваюць нам, што пасля здачы крыві адчуваюць сябе вельмі добра. З'яўляецца лёгкасць, паляпшаецца настрой.

Пры дрэнным харчаванні і пастаянннай здачы крыві эрытрацыты не паспяваюць узнаўляцца ў поўным аб'ёме. Тады надыходзіць жалезадэфіцытная анемія. Чалавек адчувае слабасць, галавакружэнне, павышаецца стамляльнасць. Жанчынам на працягу пяці дзён пасля менструальнага цыкла таксама нельга здаваць кроў. Да родаў рэкамендуецца здаваць кроў як мага радзей, ад здачы плазмы лепш увогуле ўстрымацца. Па нарматывах на працягу каляндарнага года мужчыны могуць здаваць кроў не больш за пяць разоў, жанчыны — не больш за чатыры. Пасля пяці разоў павінен быць перапынак у 90 дзён.

— Калі чалавек становіцца актыўным донарам, — працягвае Збышак Іванавіч, — мы яму тлумачым, што ён павінен весці здаровы лад жыцця і адпаведна харчавацца. Здаровы лад жыцця — гэта калі ты не паліш, не п'еш, добра высыпаешся, харчуешся правільна, ужываеш бялкі, вітаміны, мінералы. Арганізм пры гэтым нічога не губляе. У выпадку, калі ты здаеш кроў толькі дзеля грошай і гэтыя 68 000 проста прагуляеш, для здароўя гэта будзе, вядома, шкодна.

Студэнткі БДУ Віялета і Лена неаднаразова здавалі кроў. Грошы дзяўчаты звычайна трацяць, хто на што.

**Віялета:** — Я купіла сабе ежы, а частку патраціла на адзенне. Трацінь усё на добрае харчаванне? А сэнс тады які ў здачы крыві?

**Алена:** — Адразу пасля здачы я купляю тры-чатыры гематагены і літр гранатавага соку, а таксама шакалад, каб узнавіць недахоп жалеза. На ўсялякія такія рэчы трачу каля 20-30 тысяч. Проста падсвядома хочацца. Купіш шакаладку — і нармальна. Астатнія грошы — як пойдзе, іх на харчаванне не трачу. Напэўна, ніхто ўсё на харчаванне не траціць.

Такая ж сітуацыя і ў пяцікурснікаў БАТУ, якіх сустрэла на станцыі пералівання крыві.

— Прагуляем, — смяюцца хлопцы ў адказ на маё пытанне.

**Ігар КАВАЛЕНКА заслужаны донар Беларусі, старшыня магілёўскага рэгіянальнага дабрачыннага грамадскага аб'яднання донараў «Кропля жыцця»:**

— На сёння я не магу асуджаць людзей, якія здаюць кроў дзеля грошай. У параўнанні з Еўропай у нас цяжкая эканамічная сітуацыя. Калі чалавек прызвычаіўся за столькі гадоў здаваць кроў за грошы, то бясплатна ён гэтага рабіць не будзе. Здача крыві — справа дабрачынная. Але бясплатнае донарства трэба ўводзіць паступова, каб хворыя людзі, крый Божа, не засталіся без дапамогі. Па-першае, трэба стварыць умовы для донараў. Мы прапаноўвалі нашай мясцовай паліклініцы стварыць асобныя кабінеты для медыцынскага агляду донараў, каб яны не кантактавалі з хворымі. Бо калі чалавек прыходзіць да тэрапеўта, сядзіць у гэтай вялікай чарзе — ёсць верагоднасць падхапіць які-небудзь вірус. Плюс была прапанова ўвесці базу звестак па донарах, куды б сцякалася ўся інфармацыя пра донара, на што ён хварэе і г.д. Але ўсё засталося па-ранейшаму. У Еўропе праблем са здачай крыві няма, там ты пад'язджаеш у любы зручны для цябе час, здаеш кроў за 15-20 хвілін — і ўсё.

Па-другое, донарства трэба ўзводзіць у ранг подзвігу. Чалавек жа выратоўвае жыцці. Ім проста неабходная падтрымка і павага. Каб чалавек не саромеўся сказаць, што ён донар. Прапаганда міласэрнасці, дабрачыннасці павінна быць. Павінна быць рэклама на тэлебачанні, у газетах, на вуліцах.

У Еўропе, напрыклад, існуе шмат розных узнагарод для донараў. У Англіі донар спачатку заслугоўвае бронзавы медаль, пасля срэбны, потым залаты. Калі ён з'яўляецца поўным кавалерам усіх гэтых ордэнаў, то мае пэўныя льготы па падатках, жыллёвых плацяжах і г.д. Для іх гэта вельмі ганарова. Калі я быў у Савеце Еўропы, то прычапіў свой ордэн. Мяне пыталі, што гэта такое, я адказваў, што я ганаровы донар Беларусі. Яны былі ўражаны, руку паціскалі і казалі, што гэта вельмі добра. У нас такой рэакцыі не сустракаў.

У холе станцыі пералівання крыві пастаянны рух. Нехта выходзіць з забінтаванай рукой, нехта п'е гарбату, хтосьці запісваецца на аркушы і ідзе здаваць рэчы ў гардэроб. На ганку стаяць два маладыя хлопцы.

— Грошы ёсць. Ну што, па піўку? — запытальна глядзіць адзін на другога.

— Па піўку, — згаджаецца другі.

**Настасся ЗАНЬКО.**

## Медыкі рэкамендуюць прымяняць фотаахоўныя сродкі з першых месяцаў вясны

Фотаахоўныя сродкі, якія паніжаюць адчувальнасць да сонечнага выпраменьвання, рэкамендавана прымяняць ужо з першых месяцаў вясны. Пра гэта расказала галоўны пазаштатны дэрматавенеролаг Мінздрава, дацэнт кафедры дэрматавенералогіі БелМАПА, кандыдат медыцынскіх навук Ірына Шаманская.

Паводле яе слоў, не трэба думаць, што ахоўваць сваю скуру ад сонца неабходна толькі тады, калі яно ўжо прыпякае. Сонца найбольш актыўнае ў вясеннія месяцы, і перыяд актыўнасці цягнецца аж да таго часу, пакуль на дрэвах не вырасце лісце, г.зн. з лютага і да пачатку чэрвеня. Менавіта ў гэты час арганізм чалавека найбольш падпадае пад уздзеянне ўсяго спектра ўльтрафіялетавых промняў, якія з'яўляюцца небяспечнымі. Працяглае знаходжанне на вясеннім сонцы пагражае абвастрэннем хранічных захворванняў.

«Беражыце сваю скуру ад сонечных промняў, не выходзьце на вуліцу вясной без прымянення фотаахоўных сродкаў з SPF-абаронай не менш за 10—15 светлавых фільтраў. Не трэба песціцца на сонцы ў першыя дні больш за 7—8 хвілін. Прыкладна на столькі ж кожны дзень дапушчальна павялічваць час знаходжання на свежым паветры не ў цені. У працэсе падрыхтоўкі да прыняцця сонечных ваннаў медыкі рэкамендуюць прымаць вітамінныя комплексы з вітамінамі А і Е, якія ўтрымліваюць тлушчы», — адзначыла Ірына Шыманская.

Пад уздзеяннем празмерна актыўнага вясной ультрафіялету ёсць вялікая верагоднасць атрымання апёку. Гэта ў большай ступені датычыцца аматараў прыроды, якія адкрываюць у вясеннія месяцы дачны сезон. Калі такая непрыемнасць здарылася, звярніцеся па дапамогу да доктара. «Спецыяльныя медыцынскія прэпараты для лячэння апёкаў на скуры больш эфектыўныя, чым бабуліны падручныя сродкі», — сказала Ірына Шыманская.

Загараць без шкоды для здароўя можна зусім не кожнаму. Спецыяліст адзначыла, што не трэба імкнуцца да шакаладнага колеру скуры тым, хто мае дабраякасныя і злаякасныя новаўтварэнні, а таксама людзям, якія прымаюць медыкаменты з фотатаксічным уздзеяннем — найперш гэта антыбіётыкі тэтрацыклінавага раду.

**Вольга ШАЛЯГОВІЧ, БЕЛТА.**

